7. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). Ф. 205. Оп. 1. Д. 1.
8. НАРБ. Ф. 4. Оп. 1. Д. 131.
9. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 1.
10. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 1.
11. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, 1921–1927: да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. Менск [Мінск: б. в.], 1927.
12. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 15.
13. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 4.
14. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 1.
15. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 1.
16. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 12.
17. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 10.
18. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 9.
19. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 245.
20. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 10.
21. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 217.
22. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 245.
23. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 13.
24. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 10.
25. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 5.
26. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 245.
27. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 245.
28. Гернович, Т. Д. Становление государственных архивов Беларуси (1919–1922) // Журнал Белорусского государственного университета. История = Journal of the Belarusian State University. Historical sciences. 2019. № 3. С. 46–56.
29. Пичета В. И. Воспоминания о Московском университете (1897–1901 гг.) // Московский университет в воспоминаниях современников (1755–1917). М.: «Современник», 1989. С. 583–596.
30. НАРБ. Ф. 205. Оп. 1. Д. 272.

# БЕЛАРУСКАЯ АДУКАЦЫЯ НА МЯЖЫ XIX–XX СТАГОДДЗЯЎ

***Ю. І. Літвіноўская***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*вул. П. Броўкі, 6, 220013, г. Мінск, Беларусь, litwinowski@yandex.by*

Другая палова XIX – пачатак XX ст. былі перыядам інтэнсіўнага сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускіх зямель. Вялікі крок наперад зрабіла справа асветы і адукацыі насельніцтва, што праявілася ў росце колькасці пісьменных, імклівым пашырэнні пачатковых і сярэдніх школ. У артыкуле разглядаюцца дзеянні органаў улады па мадэрнізацыі, наколькі гэта было магчыма, сістэмы адукацыі на Беларусі да ўзроўню, адпавядаючага патрэбам часу.

***Ключавыя словы:*** асвета; адукацыя; школа; гімназія; вучылішча.

# БЕЛОРУССКОЕ ОБРАЗОВАНИЕ НА РУБЕЖЕ XIX–XX ВЕКОВ

***Ю. И. Литвиновская***

*Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники*
*ул. П. Бровки, 6, 220013, г. Минск, Беларусь, litwinowski@yandex.by*

Вторая половина XIX – начало XX в. были периодом интенсивного социально-экономического развития белорусских земель. Большой шаг вперед сделало дело просвещения и образования населения, что проявилось в росте числа грамотных, стремительном расширении начальных и средних школ. В статье рассматриваются действия органов власти по модернизации, насколько это было возможно, системы образования на Беларуси до уровня, отвечающего потребностям времени.

***Ключевые слова:*** просвещение; образование; школа; гимназия; училище.

## BELARUSIAN EDUCATION AT THE TURN OF THE XIX–XX CENTURIES

***Y. Litvinouskaya***

*Belarusian state University of Informatics and Radioelectronics*
*P. Brouki St., 6, 220013, Minsk, Belarus,* litwinowski@yandex.by

The second half of the XIX–XX centuries was a period of intensive socio-economic development of the Belarusian lands. A great step forward was made by the cause of education and education of the population, which was manifested in the growth of the number of literate, the rapid expansion of primary and secondary schools. The article examines the actions of the authorities to modernize, as far as possible, the education system in Belarus to a level that meets the needs of the time.

***Keywords:*** enlightenment; education; school; gymnasium; college.

Развіццё капіталізму пасля падзення прыгоннага права выклікала патрэбу ў больш шырокім развіцці адукацыі. У 70–80-я гг. XIX ст. на беларускіх землях Расійскай імперыі пачынаюць ажыццяўляцца буржуазныя рэформы, у тым ліку і ў галіне народнай адукацыі. Іх сутнасць заключалася у тым, што навучальныя ўстановы розных ведамстваў у пераважнай большасці перайшлі ў падпарадкаванне Міністэрства народнай асветы. Дваранскія пачатковыя вучылішчы былі ліквідаваны. Вясковыя народныя вучылішчы і двухкласныя пачатковыя вучылішчы сталі школамі. У гарадах навучальнымі ўстановамі ніжэйшага тыпу сталі гарадскія вучылішчы. Мужчынскія гімназіі былі падзелены, у адпаведнасці са школьным статутам 1804 г., на тры тыпы з 8-гадовым курсам навучання – класічныя з грэчаскай і лацінскай мовамі, класічныя з лацінскай мовай і рэальныя без старажытных моў, але з прыродазнаўчым ухілам. Класічныя гімназіі давалі права паступлення ва ўніверсітэты і іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы, а рэальныя – толькі у вышэйшыя тэхнічныя навучальныя ўстановы. Паводле новага статута ад 1871 г. класічныя гімназіі сталі асноўным тыпам сярэдніх навучальных устаноў. Старажытным мовам у іх адводзіўся 41% вучэбнага часу. Рэальныя гімназіі ў 1872 г. былі пераўтвораны ў рэальныя вучылішчы [6, с. 5].

У 1864 г. былі адменены саслоўныя абмежаванні для атрымання сярэдняй адукацыі, але фактычна ў гімназіях займаліся пераважна дзеці прывілеяваных саслоўяў. Цыркуляр «Аб мерах паляпшэння складу навучэнцаў у гімназіях і прагімназіях» ад 18 чэрвеня 1887 г. прадпісваў не прымаць у гімназіі «дзяцей кучараў, лакеяў, паvaroў, прачак, дробных крамнікаў». Былі закрыты падрыхтоўчыя класы, якія давалі магчымасць паступаць у гімназіі дзецям малазабяспечаных бацькоў. У ліпені 1887 г. быў выдадзены новы цыркуляр «Аб абмежаванні прыёму ў сярэднія навучальныя ўстановы яўрэяў 10% нормаю». Разам з тым, у другой палове XIX ст. пачалі адкрывацца жаночыя сямікласныя гімназіі [6, с. 5].

У 1872 г. было зацверджана палажэнне аб гарадскіх вучылішчах, якія з’яўляліся навучальнымі ўстановамі ніжэйшага тыпу: аднакласныя, 2, 3 і 4 класныя. У іх вучыліся дзеці з сем’яў рознага маёмаснага становішча. Тыя, хто закончыў гарадскія вучылішчы, не маглі паступаць не толькі ў вышэйшыя, але нават і ў сярэднія навучальныя ўстановы. Акрамя таго, у гарадах да пачатку XX ст. існавалі пры царкоўных прыходах пачатковыя прыходскія адна- і двухкласныя школы дарэформеннага тыпу, а таксама 2, 3 і 4-класныя мужчынскія і жаночыя духоўныя вучылішчы царкоўнага ведамства [1, с. 191–192].

Вынікі школьнай рэформы на Беларусі былі менш значныя, чым у цэнтральных губернях Расіі, таму што тут яна супала з устанаўленнем рэакцыйнага курсу ў палітыцы царызму пасля падаўлення паўстання 1863 г. Царызм праводзіў моцны ідэалагічны ўціск у галіне культуры. Таму беларуская асвета ў канцы XIX ст. развівалася ў даволі складаных абставінах. Ужываліся рэпрэсіўныя меры ў дачыненні да тых навучальных устаноў, навучэнцы якіх так ці інакш падтрымлівалі паўстанне 1863 г. У сакавіку 1864 г. быў закрыты Земляробчы інстытут у Горы-Горках, а таксама восем сярэдніх навучальных устаноў у Віленскай вучэбнай акрузе. Амаль 2 тыс асоб за ўдзел у «мяцяжы» былі выключаны з навучальных устаноў, ліквідаваны ўсе польскія школы і закрыты амаль усе прыватныя вучылішчы з той прычыны, што яны маглі з’явіцца «рассадником полонизации». Распараджэннем папячыцеля Віленскай вучэбная акругі загадвалася ўсім выкладчыкам клапаціцца аб тым, каб у сценах навучальных устаноў гутарковай мовай была толькі руская мова. Адхіляліся ад пасад мясцовыя настаўнікі-каталікі, у ліку якіх было нямала беларусаў. На іх месцы запрашаліся «добранадзейныя» асобы з унутраных губерняў. У 1866 г. у вышэйшых навучальных установах Расіі была ўведзена працэнтная норма для вучняў-католікаў, таму што ўрад лічыў усіх

іх палякамі. Быў устаноўлены строгі паліцэйскі нагляд за паводзінамі навучэнцаў.

18 мая 1864 г. Аляксандр II зацвердзіў «Часовыя правілы» для народных вучылішчаў Паўночна-Заходняга краю. Пачатковыя школы поўнасцю аддаваліся пад кантроль праваслаўнага духавенства, чыноўнікаў і паліцыі. Прадугледжвалася выкладанне самых элементарных ведаў рускай і царкоўна-славянскай граматы, арыфметыкі, навучанне «дагматам праваслаўнай веры і царкоўным спевам». У нядзельныя і святочныя дні вучні абавязаны былі ўсёй школай хадзіць у царкву.

Большая частка вучэбнага часу адводзілася «Закону Божаму», малітвам, царкоўным спевам. Упраўленне Віленскай вучэбнай акругі рыхтавала свае падручнікі па рускаму чытанню. Яны адрозніваліся ад падручнікаў рускіх губерняў своеасаблівым вялікадзяржаўным тлумачэннем гісторыі краю, вялікай колькасцю апавяданняў па гісторыі праваслаўя ў Паўночна-Заходнім краі [1, с. 193].

Царскія ўлады адпускалі на асвету мізерныя грашовыя сродкі, таму колькасць школ не задавальняла патрэбы насельніцтва. На тэрыторыі беларускіх губерняў многія школы поўнасцю знаходзіліся на ўтрыманні сялян. Напрыклад, у 1881 г. на забеспячэнне пачатковых народных школ у Мінскай губерні паступіла з дзяржаўнага казначэйства 38420 руб., а ад сельскай грамады 66859 руб. Нягледзячы на ўсё школьная справа развівалася. У 1868 г. налічвалася 1391 навучальная ўстанова, а ў 1881 г. – 2185. Павольна павялічвалася і колькасць навучэнцаў – з 54417 да 63584 [1, с. 195]. Большасць настаўнікаў народных школ не мелі неабходнай падрыхтоўкі. Таму ў 1864–1876 гг. у беларускіх губернях імперыі былі адкрыты чатыры настаўніцкія семінарыі – у Маладзечна, Нясвіжы, Свіслачы і Полацку. Але праблемы нястачы спецыялістаў гэта не вырашыла. Кожная семінарыя выпускала ў год не болей 20–30 настаўнікаў [3, с. 207].

У пачатку1880-х гг. у развіцці адукацыі пачаліся вельмі складаныя часы. З уступленнем на прастол Аляксандра III у Расіі наступіў перыяд жорсткай палітычнай рэакцыі. У 1884 г. было выдадзена палажэнне аб царкоўна-прыходскіх школах. Пачаўся наступ на народныя вучылішчы, многія з якіх былі закрыты. Замест іх пачалі адкрываецца царкоўна-прыходскія школы і школы граматы, якія былі падначалены мясцоваму праваслаўнаму духавенству. Такім чынам улада імкнулася зрабіць працэс адукацыі, асабліва ў яго найбольш масавай частцы, больш кантраляваным. У 1899 г. колькасць царкоўна-прыходскіх школ і школ граматы

павялічылася да 5814, а народных вучылішчаў скарацілася амаль на 200 адзінак (з 1198 да 999) [1, с. 197–199].

Сярэдняя школа да канца XIX ст. працягвала заставацца школай прывілеяваных саслоўяў. Высокая плата за навучанне рабіла гэтыя ўстановы недаступнымі для большасці насельніцтва. У гімназіях, іх у 1898 г. налічвалась 20 з колькасцю навучэнцаў каля 5000, вучыліся амаль выключна дзеці дваран, чыноўнікаў, духавенства і буржуазіі.

Пануючае месца ў сістэме адукацыі Беларусі ў 1860–90-я гг. займала пачатковая школа. Галоўная задача, якая ставілася перад ёй, – умацоўваць у народзе рэлігійныя паняцці і толькі потым даваць веды. Яна мела адзіны вучэбны план, які ўключаў Закон Божы, чытанне царкоўных і грамадзянскіх кніг, лік, царкоўныя спевы. Навучанне дапускалася толькі на рускай мове. Асноўнымі тыпамі школ у сістэме пачатковай адукацыі ў сельскай мясцовасці з'яўляліся народныя вучылішчы, царкоўнапрыходскія школы і школы граматы, а ў гарадах – прыходскія павятовыя і гарадскія вучылішчы.

Пад уплывам эканамічнага развіцця краіны ў другой палове XIX ст. колькасць навучальных устаноў і навучэнцаў у іх павялічылася ў некалькі разоў. Толькі ў народных вучылішчах, царкоўна-прыходскіх школах і школах граматы ў 1899 г. навучалася 216127 дзяцей [1, с. 199]. «Такое павелічэнне колькасці вучняў … вытлумачваецца толькі ўплывам адных выгад ад асветы, што … сведчыць пра … глыбокія маральныя матывы, якія ляжаць … ва ўмацаванні поглядаў на адукацыю як на жыццёвую неабходнасць…» – пісаў адзін з чыноўнікаў канцылярыі мінскага губернатара [2, с. 277].

Між тым тое, што было дасягнута ў галіне народнай адукацыі ў канцы XIX ст., мела важнае значэнне ў гаспадарчым і культурным жыцці Беларусі – пашырэнне пісьменнасці ў народзе, фарміраванне беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі, развіццё нацыянальнай культуры. Аднак узровень народнай асветы і колькасць пісьменнага насельніцтва прадоўжвалі заставацца нізкімі – 25,7% у адносінах да агульнай колькасці жыхароў Беларусі [1, с. 200]. На працягу XIX ст. у перадавых краінах свету было ўведзена абавязковае ўсеагульнае навучанне дзяцей – у Даніі з 1814 г., ЗША – з 1852 г., Вялікабрытаніі – з 1870 г. У канцы стагоддзя доля пісьменных сярод мужчынскага насельніцва Заходняй Еўропы складала каля 90 %, Расіі – 21. Паводле перапісу 1897 г., у беларускіх губернях імперыі пісьменнымі былі 36,4 % мужчын [7, с. 166–167].

На пачатку XX ст. аб'ектыўныя патрэбы сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця прымусілі царскі ўрад пайсці на пэўныя

змены ў змесце адукацыі. З 1900 да 1914 г. колькасць школ усіх тыпаў, уключаючы прыватныя, павялічылася з 6297 да 7593, а навучэнцаў у іх з 243,9 тыс. да 547,1 тыс. Асабліва істотныя змены адбыліся сярод школ пачатковага навучання. Паменшылася колькасць школ царкоўнага ведамства – з 5000 да 1500. Замест царкоўна-прыходскіх школ адкрываліся народныя вучылішчы [1, с. 527]. Гарадскія вучылішчы – пачатковыя школы павышанага тыпу, створаныя паводле Палажэння 1872 г., у 1912 г. былі ператвораны ў вышэйшыя пачатковыя вучылішчы – 4-х класныя агульнаадукацыйныя школы павышанага пачатковага тыпу. Прыкметна павялічылася сетка сярэдніх школ. Калі ў 1900 г. было 14 дзяржаўных сярэдніх школ (гімназіі, прагімназіі, рэальныя вучылішчы), то ў 1914 г. ужо 88, у тым ліку 33 дзяржаўныя. Як і раней, гэтыя навучальныя ўстановы з-за высокай платы за навучанне былі даступны для вельмі абмежаванай колькасці дзяцей [1, с. 528].

У пачатку новага стагоддзя павялічылася і сетка вучылішчаў прафесійнага навучання. Ва ўсіх сярэдніх спецыяльных школах навучалася 1400 чалавек. Працавалі таксама тры настаўніцкія інстытуты – у Віцебску, Мінску і Магілёве. З 1911 г. пачало дзейнічаць Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута, дзе вядомы беларускі гісторык А. Сапуноў чытаў курс гісторыі Паўночна–Заходняга краю. Яго выпускнікі атрымлівалі няпоўную вышэйшую адукацыю [8, с. 291]. Правоў вышэйшай адукацыі гэтыя інстытуты не мелі. Аднак адкрыццё настаўніцкіх інстытутаў стала значным крокам у паляпшэнні падрыхтоўкі педагагічных кадраў, важным фактарам у культурным і грамадскім жыцці [1, с. 528].

З’явіліся першыя падручнікі для дзяцей на беларускай мове. Вядомая беларуская пісьменніца Цётка адна з першых пачала пісаць творы для дзяцей на беларускай мове. На Украіне яна выдала першую такую кнігу «Гасцінец для малых дзяцей», у якую ўвайшлі кароткія апавяданні, загадкі, прыказкі і прымаўкі. У 1906 г. выйшаў яе буквар – «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання». У тым жа годзе ўбачыла свет хрэстаматыя «Першае чытанне для дзетак беларусаў» [2, с. 411]. У 1910 г. у Вільні быў надрукаваны першы дапаможнік па гісторыі Беларусі за аўтарствам В. Ластоўскага – «Кароткая гісторыя Беларусі». З’яўленне дапаможніка стала важней падзеяй у культурным жыцці баларусаў [8, с. 293]. Якуб Колас падрыхтаваў і выпусціў у свет кнігу «Другое чытанне для дзяцей беларусаў». Гэта была хрэстаматыя для вучняў пачатковых школ Беларусі [4, с. 210].

Аднак некаторыя змены стан народнай адукацыі істотна не палепшылі. Школ па-ранейшаму не хапала, а іх фінансаванне дзяржавай было мізэрным і нераўнамерным. Напрыклад, выдаткі на адну школу ў Віленскай вучэбнай акрузе складалі 620,7 руб. у год, у той час як у Маскоўскай – 1011,2 руб., а на аднаго жыхара трацілася адпаведна 43,2 і 82,5 кап. у год. У выніку ў Беларусі адна пачатковая школа прыпадала на 1416 жыхароў, і ў іх навучалася толькі 18,4% дзяцей школьнага ўзросту [2, с. 410]. Уся сістэма адукацыйна-выхаваўчых і культурна-асветных мерапрыемстваў краіны патрэбавала радыкальных змен. Востры недахоп настаўніцкіх кадроў, матэрыяльныя цяжкасці рабілі тагачасную сістэму адукацыі ў Беларусі балючай праблемай, якая патрабавала неадкладнага рашэння.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. Т. 2. Мінск: Навука і тэхніка, 1972.
2. Гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 4. Мінск: Экаперспектива, 2005.
3. Дарашэвіч Э. К. і інш. Асвета // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1. Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1993. С. 204–211.
4. Парашкоў С. А. Гісторыя культуры Беларусі. Мінск: Беларуская навука, 2003.
5. Патапенка Н. Я., Перапёлкіна А. В. Гісторыя культуры Беларусі. Мінск: Из-во Гревцова, 2009.
6. Сянькеіч Г. С. Гімназіі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1996. С. 5–6.
7. Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі / пад. рэд. Л. В. Лойкі. Мінск: РІВШ, 2005.

Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветных цывілізацый / пад рэд В. І. Галубовіча і Ю. М. Бохана. Мінск: Экаперспектыва, 2005.


# ПРОТОКОЛЫ НК РКИ ПО ОБСЛЕДОВАНИЮ ШТАТОВ И СТРУКТУРЫ БГУ КАК ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ ГОСУДАРСТВЕННОГО КОНТРОЛЯ В СФЕРЕ АРХИВНОГО ДЕЛА И ДЕЛОПРОИЗВОДСТВА


***И. Н. Панасовец***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, Panasovets. ilia1996@gmail.com*



В статье рассматриваются протоколы Наркомата рабоче-крестьянской инспекции (НК РКИ) по обследованию работы Белорусского государственного университета как исторический источник по истории государственного контроля в сфере делопроизводства 20-х – 30-х гг. XX в. На основе информации документов анализируется порядок проведения контрольных мероприятий в области работы с документами в этот период. Отмечается, что ключевую роль в совершенствовании работы учреждений в сфере архивного дела и делопроизводства в БССР занимала работа рабоче-крестьянской инспекции. В ситуации отсутствия выработанной